## Змест / Contents

Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Прэзентацыя праграмы EU4Belarus SALT. Падтрымка беларускіх студэнтаў, даследчыкаў і спецыялістаў / Presentation of the EU4Belarus SALT program. Support to Belarusian students, researchers, and professionals ..... 1

Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Прэзентацыя беларускіх навуковых інстытуцый у замежжы / Presentation of Belarusian Scientific Institutions Abroad ..... 1

Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Кафедра беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта - пошук новага падыходу ў даследваннях у галіне беларусістыкі / Department of Belarusian Studies, University of Warsaw - searching for a new approach in research in the field of Belarusian studies ..... 2

Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Прэзентацыя кнігі "Unia literacka: leksykon pojęć i biogramów" (2024) / Presentation of the book "Literary Union: A Lexicon of Concepts and Biographies" (2024) ..... 2

Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Семантычныя змены ў праславянскіх "маральных" словах: рэалізацыя беларускай часткі праекту "OXYMORAL" / Semantic changes in Proto-Slavic "moral" words: implementation of the Belarusian part of the "OXYMORAL" project ..... 3

Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Паэзія як права чалавека: зборнік вершаў Юрыя Іздрыка "Human Right" (hochrot/minsk) у беларускіх перакладах / Poetry as a human right: a collection of poems by Yuri Izdryk "Human Right" (hochrot/minsk) in Belarusian translations ..... 3

Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Прэзентацыя анталогіі “Свет скончыўся, а мы не” / Presentation of an anthology of contemporary Belarusian poetry in Italian translation ..... 4

Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Прэзентацыя пятага выпуску альманаха "Мінская школа" / Presentation of the fifth issue of the almanac "Minsk School" ..... 4

Публічная прэзентацыя / Public Presentation, “Новым імкненьням даць новыя формы”. Вацлаў Ластоўскі і беларускія мовазнаўцы ў культурным дыскурсе 1920-30-х гг. / Book launch: materials of the international conference on Belarusian linguists of 1920-30s ..... 5

Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Прэзентацыя 3-х кніг Алеся Белага 2024-2025 гг. / Presentation of 3 books by Alies Bely published in 2024-2025. ..... 5

Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Прэзентацыя беларускага перакладу ўспамінаў Бэлы Шагал "Запаленыя свечкі" / Presentation of the Belarusian translation of Bella Chagall's memoirs "Burning Lights" ..... 6

Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Прэзэнтацыя гістарычнай тэтралёгіі Крысьціны Сабаляўскайце Silva rerum / Presentation of Krystyna Sabaliauskaitė's historical tetralogy Silva rerum ..... 6

Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Прэзентацыя кнігі Вольгі

Барышнікавай "І даўней так пелі. Музычны фальклор старавераў паўночна-заходняй Беларусі" / Presentation of Volha Baryshnikava's book "They Sang Like That in Olden Days: Old Believers’ Musical Folklore of Northwestern Belarus" ........ 7

Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Практычнае прымяненне LLM-мадэляў на прыкладзе апрацоўкі фальклорна-этнаграфічных дадзеных / Practical Application of LLM Models for Processing Folklore and Ethnographic Data ........ 7

Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Заснаванне Belarus Voices: размова пра стварэнне новай серыі кніг / Founding Belarus Voices: A Discussion on Building a New Book Series ........ 7

Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Суверэннымі не нараджаюцца… Прэзентацыя першага тэматычнага нумара часопіса Free Belarus Journal / No One Is Born Sovereign… Presentation of the first thematic issue of Free Belarus Journal ........ 8

Круглы стол / Round table, “Савецкая спадчына і яе культурны ўплыў: ці патрэбная комплексная дэкамунізацыя і дэкаланізацыя беларускай культуры і палітыкі памяці?” / “Soviet Heritage and Its Cultural Influence: Is Comprehensive Decommunization and Decolonization of Belarusian Culture and Memory Politics Necessary?” ........ 9

Круглы стол / Round table, “Ці месца ў школе патрыятычнаму выхаванню?” / "Is there a place for patriotic education in school?" ........ 9

Круглы стол / Round table, Вусная гісторыя Беларусі за межамі краіны: перспектывы і выклікі / Oral History of Belarus Abroad: Perspectives and Challenges ........ 10

Круглы стол / Round table, Ex Libris. Грамадскія навукі і адаптацыі Сяргея Лазніцы: ад Васіля Быкава да Джонатана Літэла / Ex Libris. Social sciences and adaptations of Sergei Loznitsa: from Vasil Bykau to Jonathan Littell ........ 11

Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Прэзентацыя рамана Змітра Вішнёва “Я — тое мяса, якое прыгатаваў Зміцер” і канцэрт-імправізацыя Андрэя Штайнке / Book launch of the new novel „I’m the meat that Zmicier has prepared“ by Zmicier Vishniou & improvised concert by Andrei Steinke ........ 11

**Час і месца / Time and place: 26.09, 16.30-18.00 - 1.401 (Dorotheenstraße 24)**

### 1. Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Прэзентацыя праграмы EU4Belarus SALT. Падтрымка беларускіх студэнтаў, даследчыкаў і спецыялістаў / Presentation of the EU4Belarus SALT program. Support to Belarusian students, researchers, and professionals

мадэратар: Gumbrevičienė Lina
**Канцэпцыя:**
Прэзентацыя праграмы падтрымкі EU4Belarus Support for Advanced Learning and Training (SALT) для беларускіх студэнтаў, даследчыкаў і спецыялістаў, якія пацярпелі ад рэпрэсій з-за сваёй грамадзянскай пазіцыі ў 2020 годзе і пазней, або якія знаходзяцца ў групе рызыкі. Падтрымка прадастаўляецца ў розных акадэмічных, прафесійных і навучальных формах.
Presentation on the EU4Belarus Support for Advanced Learning and Training (SALT) programme's support to Belarusian students, researchers, and professionals who have suffered repression due to their civic stance in 2020 and beyond, or who are at risk. The support is provided in various academic, professional, and training forms.

Presenters: Lina Gumbrevičiene, Lina Katinaitė

### 2. Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Прэзентацыя беларускіх навуковых інстытуцый у замежжы / Presentation of Belarusian Scientific Institutions Abroad

мадэратар: Liasovich Sviatlana
**Канцэпцыя:**
Прэзентацыя прысвечана агляду дзейнасці беларускіх навуковых арганізацый за мяжой, якія ставяць на мэце даследаванне, захаванне і папулярызацыю беларускай культуры, гісторыі, мовы. Плануецца прадставіць асноўныя напрамкі даследаванняў, праектаў, міжнароднага супрацоўніцтва і навуковых інавацый. Прэзентацыя дазволіць арганізацыям прадэманстраваць іх дасягненні, навукова-даследчы патэнцыял, магчымасці для супрацоўніцтва. Яна паспрыяе папулярызацыі гуманітарных навук і прыцягненню спецыялістаў у свае шэрагі.
The presentation is dedicated to an overview of the activities of Belarusian scholarly organizations abroad that aim to research, preserve, and promote Belarusian culture, history, and language. It is planned to present the main directions of research, projects, international cooperation, and scholarly innovations. The presentation will enable the organizations to showcase their achievements, research potential, and opportunities for collaboration. It will also help popularize the humanities and attract specialists to their ranks.

Удзельнікі прэзентацыі / Presentation participants: Інстытут беларускай мовы (Святлана Лясовіч), Інстытут публічнай гісторыі (Ігар Станкевіч), Беларускі інстытут у Празе (Іна Каліта)

**Час і месца / Time and place: 26.09, 16.30-18.00 - 1.404 (Dorotheenstraße 24)**

### 1. Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Кафедра беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта - пошук новага падыходу ў даследваннях у галіне беларусістыкі / Department of Belarusian Studies, University of Warsaw - searching for a new approach in research in the field of Belarusian studies

мадэратар: Moskwin Andriej

**Канцэпцыя:**

Кафедра беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта была створана ў 1956 годзе. Сёння гэта адзіная кафедра беларусістыкі за межамі Беларусі. За апошнія семдзесят гадоў, разам са змяненнем палітычнай сітуацыі, змяняліся і падыходы да даследаванняў. Перыяд дэмакратызацыі, які пачаўся ў 1991 г., і ў прыватнасці расійска-ўкраінская вайна, зрабілі пошук новых падыходаў да даследавання беларускага мовы, літаратуры і культуры асабліва важным. Усё большую важнасць набываюць такія пытанні, як дэкаланізацыя, эмігранцкая літаратура (не толькі сучасная, але і XX ст.), глотадыдактыка, феномен беларускай драматургии і тэатра і многія іншыя.
The Department of Belarusian Studies at the University of Warsaw was established in 1956. Today it is the only Department of Belarusian Studies outside Belarus. Over the past seventy years, along with the changing political situation, approaches to research have also changed. The period of democratization that began in 1991, and in particular the Russian-Ukrainian war, made the search for new approaches to the study of the Belarusian language, literature and culture particularly important. Issues such as decolonization, émigré literature (not only modern, but also 20th century), glottodidactics, the phenomenon of Belarusian dramaturgy and theater, and many others are becoming increasingly important.

Удзельнікі прэзентацыі / Presentation participants: доктар навук Андрэй Масквін, праф. / dr hab. Andriej Moskwin, prof. UW, доктар навук Радаслаў Калета, праф. / dr hab. Radosław Kaleta, prof. UW, кандыдат навук Катажына Дрозд-Урбаньска / dr Katarzyna Drozd-Urbańska

### 2. Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Прэзентацыя кнігі "Unia literacka: leksykon pojęć i biogramów" (2024) / Presentation of the book "Literary Union: A Lexicon of Concepts and Biographies" (2024)

мадэратар: Kuryan Inesa

**Канцэпцыя:**

Мерапрыемства прысвечана прэзентацыі новай літаратуразнаўчай працы ў форме лексікону, значнага аб'ёму каля 350 старонак, што змяняе і ўдакладняе ўяўленні пра тэматыку польскай літаратуры і творчась вядомых аўтараў. Лексікон з'яўляецца вынікам супрацоўніцтва беларускай і польскага навукоўцаў, даследуе калектыўную свядомасць грамадзян былой Рэчы Паспалітай і яе адлюстраванне ў літаратуры.
The event is dedicated to the presentation of a new literary work in the form of a lexicon, a significant volume of about 350 pages, which changes and clarifies ideas about the subject matter of Polish literature and the work of famous authors. The lexicon is the result of cooperation between Belarusian and Polish scholars, and explores the collective consciousness of citizens of the former Polish-Lithuanian Commonwealth and its reflection in literature.

Удзельнікі прэзентацыі / Presentation participants: Wiesław Przybyła (Polska, Łódź), Інэса Кур'ян (Беларусь, Мінск / Polska, Łódź), Andrej Moskwin (Polska, Warszawa), Тамара Матыль (Беларусь, Мінск / Polska, Warszawa).

### 3. Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Семантычныя змены ў праславянскіх "маральных" словах: рэалізацыя беларускай часткі праекту "OXYMORAL" / Semantic changes in Proto-Slavic "moral" words: implementation of the Belarusian part of the "OXYMORAL" project

мадэратар: Kalechyts Alena

**Канцэпцыя:**

У прапанаванай прэзентацыі плануецца прадставіць праект "OXYMORAL", які рэалізуецца сіламі аўтарскага калектыву кафедры славянскай філалогіі Універсітэта імя Канстанціна Філосафа ў Нітры (Славакія) на прыкладзе яго беларускай часткі. У прыватнасці ўвага будзе звернута на вынікі ўласнага даследавання (дыяхранічны і сінхранічны аспекты) аксіялагічных змен у лексічным значэнні абраных моўных адзінак, а менавіта на трансфармацыю ацэначнага кампанента ў семантыцы слоў. Такім чынам, будзе прадстаўлена спроба ў вызначэнні асноўных тэндэнцый у гэтых зменах.

In the proposed presentation, the project “OXYMORAL” will be introduced as implemented by the team of the Department of Slavic Philology at Constantine the Philosopher University in Nitra (Slovakia), using its Belarusian component as a case study. Particular attention will be paid to the results of the team’s own research—both diachronic and synchronic—on axiological changes in the lexical meaning of selected linguistic units, namely the transformation of the evaluative component in the semantics of words. Accordingly, an attempt will be made to identify the main tendencies in these changes.

## Час і месца / Time and place: 26.09, 16.30-18.00 - 1.308 (Dorotheenstraße 24)

### 1. Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Паэзія як права чалавека: зборнік вершаў Юрыя Іздрыка "Human Right" (hochrot/minsk) у беларускіх перакладах / Poetry as a human right: a collection of poems by Yuri Izdryk "Human Right" (hochrot/minsk) in Belarusian translations

мадэратар: Rusiecka Natalia

**Канцэпцыя:**

Прэзентацыя зборніка перакладаў на беларускую мову вершаў Юрыя Іздрыка "Human Right" (hochrot/minsk) стане нагодай для дыскусіі пра сітуацыю ў беларускай перакладной літаратуры і развіццё эміграцыйнага кнігавыдавецтва, а таксама пра тое, як паэзія становіцца сродкам супраціву, сведчання і салідарнасці. У прэзентацыі возьмуць удзел выдавец Дзмітрый Строцаў і перакладчыца Наталля Русецкая, якія распавядуць пра гісторыю стварэння кнігі і асаблівасці працы з паэтычнымі тэкстамі.

The presentation of the collection of translations of Yuri Izdryk's poems into Belarusian, "Human Right" (hochrot/minsk), will be an occasion for a discussion about the situation in Belarusian translated literature and the development of emigration book publishing, as well as how poetry is becoming a means of resistance, testimony and solidarity. The presentation will be attended by publisher Dmitry Strotsev and translator Natalia Rusetskaya, who will talk about the history of the book's creation and the peculiarities of

working with poetic texts.

Удзельнікі прэзентацыі / Presentation participants: Дзмітрый Строцаў, Наталля Русецкая

### 2. Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Прэзентацыя анталогіі “Свет скончыўся, а мы не” / Presentation of an anthology of contemporary Belarusian poetry in Italian translation

мадэратар: Achilli Alessandro
**Канцэпцыя:**
Падзея прысвечана прэзентацыі анталогіі беларускай паэзіі ў італьянскіх перакладах “Свет скончыўся а мы не”, якая выйшла ў 2024 годзе ў італьянскім выдавецтве WriteUp Books. Анталогія раскрывае перад італьянскімі чытачамі разнастайны і амаль зусім невядомы ў Італіі свет сучаснай беларускай паэзіі: сорак аўтараў і аўтарак, больш за сотню вершаў, якія ахопліваюць перыяд з 2000 па 2024 гады. Такім чынам, анталогія з’яўляецца першым і на сённяшні дзень найбольш поўным аглядам сучаснай беларускай паэзіі, прадстаўленай вельмі рознымі па стылі, тэматыцы і нават па мове і алфавіце творамі: тут ёсць вершы на беларускай і рускай мовах, а таксама два тэксты на ідыш і тры на ўкраінскай. Вершы ўяўляюцца траекторыямі, што перасякаюцца між сабой, працінаюць пакаленні і асабістыя гісторыі, і зліваюцца ў адным трагічным і ўзнёслым хоры, які – і моўчкі, і на поўны голас – паўтарае: «Свет скончыўся, а мы не».
The event is dedicated to the launch of the anthology of Belarusian poetry in Italian translation, The World Ended and We Didn’t, published in 2024 by the Italian press WriteUp Books. The anthology opens up to Italian readers the diverse - and in Italy almost entirely unknown - world of contemporary Belarusian poetry: forty poets and over a hundred poems spanning the years 2000 to 2024. Thus, the anthology is the first and, to date, the most comprehensive survey of contemporary Belarusian poetry, presented in works that differ greatly in style, subject matter, and even in language and script: there are poems in Belarusian and Russian, as well as two texts in Yiddish and three in Ukrainian. The poems trace trajectories that intersect, cut across generations and personal histories, and merge into a single tragic and exalted chorus that - both in silence and at full voice - repeats: “The world has ended, and we have not.”

Удзельнікі прэзентацыі / Presentation participants: Алесандра Акілі, Мая Галаванава, Дзмітрый Строцаў, Ульяна Верына, Альгерд Бахарэвіч, Света Бень, Юля Цімафеева, Аксана Данільчык, Таня Скарынкіна, Зміцер Вішнёў, Віктар Жыбуль

### 3. Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Прэзентацыя пятага выпуску альманаха "Мінская школа" / Presentation of the fifth issue of the almanac "Minsk School"

мадэратар: Strotsev Dmitri
**Канцэпцыя:**
У 2025 годзе ў аўстрыйскім выдавецтве Wespennest, у рамках акцыі "33 кнігі для іншай Беларусі", пры падтрымцы Інстытута ім. Гётэ ў выгнанні і Цюрыхскага ўніверсітэта, выйшаў пяты выпуск альманаха "Мінская школа", прысвечаны беларускай паэтычнай рэфлексіі на рэвалюцыйны 2020 год і на вайну ва Украіне. Прапануецца прэзентацыя выдання з удзелам ініцыятыўнай групы праекту і аўтараў.
In 2025, the Austrian publishing house Wespennest, as part of the campaign "33 Books

for a Different Belarus", with the support of the Goethe Institute in Exile and the University of Zurich, published the fifth issue of the almanac "Minsk School", dedicated to Belarusian poetic reflection on the revolutionary year 2020 and the war in Ukraine. A presentation of the publication with the participation of the project's initiative group and authors is proposed.

Удзельнікі прэзентацыі / Presentation participants: Дзмітрый Строцаў - складальнік, аўтар; Ірына Герасімовіч - куратарка, перакладчыца; Ульяна Верына - даследчыца, аўтарка; Юлія Цімафеева - аўтарка; Марына Хоббель - аўтарка; Света Бень - аўтарка

### Час і месца / Time and place: 26.09, 16.30-18.00 - 1.301 (Dorotheenstraße 24)

### 1. Публічная прэзентацыя / Public Presentation, “Новым імкненьням даць новыя формы”. Вацлаў Ластоўскі і беларускія мовазнаўцы ў культурным дыскурсе 1920-30-х гг. / Book launch: materials of the international conference on Belarusian linguists of 1920-30s

мадэратар: Ivanou Ihar
**Канцэпцыя:**
Прэзэнтацыя зборніка: “Новым імкненьням даць новыя формы”. Вацлаў Ластоўскі і беларускія мовазнаўцы ў культурным дыскурсе 1920-30-х гг. Матэрыялы міжнароднай канфэрэнцыі да 140-годзьдзя Вацлава Ластоўскага (Лёндан, 10-11.11.2023 г.).
Удзельнікі: Караліна Мацкевіч, Уладзіслаў Гарбацкі

Presentation of the converence volume: “Giving new forms to new aspirations”. Vaclau Lastouski and Belarusian linguists in the cultural discourse of the 1920s-30s. Materials of the international conference dedicated to the 140th anniversary of Vaclau Lastouski (London, 10-11.11.2023).
Participants: Karalina Matskevich, Uladzislau Harbatski

### 2. Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Прэзентацыя 3-х кніг Алеся Белага 2024-2025 гг. / Presentation of 3 books by Alies Bely published in 2024-2025.

мадэратар: Belyi Aliaksandr
**Канцэпцыя:**
3 кнігі вядомага даследчыка і папулярызатара гісторыі матэрыяльнай культуры Літвы і Беларусі з'явіліся (1 яшчэ ў друку) за час што мінуў з папярэдняга Кангрэсу. "Самы Цымус" - прысвечаны гісторыі ўзаемадзеяння беларускай і габрэйскай кухні, самым знакавым з агульных страў 2-х народаў, якія пакінулі глыбокі след у культуры. Belarusian Cookbook - самая поўная на сёння беларуская кулінарная кніга па-англійску - са змястоўнымі гістарычнымі нарысамі і належнай увагай кухням рэгіёнаў і нацыянальных меншасцяў. "Нашы зёлкі" - грунтоўныя гісторыка-культурныя нарысы 30 самых знакавых зёлак нашай культуры, з падрабязнымі экскурсамі ў літаратуру і этнаграфію. "Самы Цымус" і "Нашы зёлкі" выраслі з пввядамленняў аўтара на Кангрэсах 2022 і 2023 гг.

3 books by the famous researcher and popularizer of the history of material culture of Lithuania and Belarus have appeared (1 is still in print) since the previous Congress. "The Most Tsymus" is dedicated to the history of the interaction of Belarusian and Jewish

cuisine, the most iconic of the common dishes of the two peoples, which left a deep mark on the culture. Belarusian Cookbook is the most complete Belarusian cookbook in English to date - with meaningful historical sketches and due attention to the cuisines of regions and national minorities. "Our Herbalists" are thorough historical and cultural sketches of 30 of the most iconic herbalists of our culture, with detailed excursions into literature and ethnography. "The Most Tsymus" and "Our Herbalists" grew out of the author's presentations at the 2022 and 2023 Congresses.

### 3. Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Прэзентацыя беларускага перакладу ўспамінаў Бэлы Шагал "Запаленыя свечкі" / Presentation of the Belarusian translation of Bella Chagall's memoirs "Burning Lights"

мадэратар: Krebs Ihar

**Канцэпцыя:**

На прэзентацыі будзе прадстаўлены першы беларускі пераклад напісаных на ідышы ўспамінаў Бэлы Шагал "Запаленыя свечкі". Успаміны складаюцца з дзвюх частак: "Brenendike likht" ("Запаленыя свечкі", 1945) і "Di ershte bagegnish" ("Першая сустрэча", 1947). Яны паказваюць жыццё ў габрэйскім Віцебску ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя і расказваюць пра дзяцінства Белы і яе першую сустрэчу з Маркам Шагалам. Падчас прэзентацыі перакладчык Ігар Крэбс раскажа пра саму Бэлу Шагал, пра моўныя асаблівасці яе ўспамінаў і пра працу над перакладам.

The presentation will present the first Belarusian translation of Bella Chagall's Yiddish memoirs "Lighted Candles". The memoirs consist of two parts: "Brenendike likht" ("Lighted Candles", 1945) and "Di ershte bagegnish" ("First Meeting", 1947). They show life in Jewish Vitebsk in the late 19th and early 20th centuries and tell about Bella's childhood and her first meeting with Marc Chagall. During the presentation, translator Igor Krebs will talk about Bella Chagall herself, about the linguistic features of her memoirs, and about the work on the translation.

### 4. Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Прэзэнтацыя гістарычнай тэтралёгіі Крысьціны Сабаляўскайце Silva rerum / Presentation of Krystyna Sabaliauskaitė's historical tetralogy Silva rerum

мадэратар: Šupa Siarhej

**Канцэпцыя:**

Сэрыя гістарычных раманаў Silva rerum Крысьціны Сабаляўскайце — найважнейшая літаратурная падзея Літвы ў XXI стагодзьдзі. Гэта першы такога аб’ёму раманны твор пра гісторыю ВКЛ XVII-XVIII стст., які можа аднолькава чытацца як літоўскі, так і як беларускі, і пры гэтым напісаны прафэсійным гісторыкам з надзвычайнай увагай да рэаліяў эпохі.
Прэзэнтуе Сяргей Шупа, перакладчык, выдавец

The Silva Rerum series of historical novels by Kristina Sabaliauskaitė is Lithuania’s most important literary event of the 21st century. It is the first work of fiction of such scope about the history of the Grand Duchy of Lithuania in the 17th–18th centuries—one that can be read equally as Lithuanian and as Belarusian—and it is written by a professional historian with extraordinary attention to the realities of the era.
Presented by Siarhei Shupa, translator and publisher.

**Час і месца / Time and place: 26.09, 16.30-18.00 - 1.502 (Dorotheenstraße 24)**

**1.Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Прэзентацыя кнігі Вольгі Барышнікавай "І даўней так пелі. Музычны фальклор старавераў паўночна-заходняй Беларусі" / Presentation of Volha Baryshnikava's book "They Sang Like That in Olden Days: Old Believers' Musical Folklore of Northwestern Belarus"**

мадэратар: Baryshnikava Volha

**Канцэпцыя:**

На прэзентацыі Вольга Барышнікава распавядзе пра асаблівасці этнамузычнай культуры старавераў заходняга Падвіння, а таксама пра тое, як стваралася кніга і літаральна па крупіцах адбываўся пошук музычнага фальклору стараверaў у фальклорна-этнаграфічных экспедыцыях ды шматлікіх архівах (дзяржаўных ды прыватных)

At the presentation, Volha Baryshnikava will talk about the distinctive features of the ethnomusical culture of the Old Believers of the western Padvinne (Western Dvina) region, as well as about how the book was created and how—literally bit by bit—the search for the Old Believers' musical folklore unfolded through folklore-ethnographic expeditions and work in numerous archives, both state and private.

Удзельнікі прэзентацыі / Presentation participants: Вольга Барышнікава, Уладзіслаў Гарбацкі, Ігар Іваноў

**2. Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Практычнае прымяненне LLM-мадэляў на прыкладзе апрацоўкі фальклорна-этнаграфічных дадзеных / Practical Application of LLM Models for Processing Folklore and Ethnographic Data**

мадэратар: Avilin Tsimafei

**Канцэпцыя:**

У прапанаванай прэзентацыі разглядаецца шэраг рэальных кейсаў апрацоўкі дадзеных, у прыватнасці фальклорна-этнаграфічных) на аснове LLM-мадэляў (chatGPT, Claude, Gemini, etc.): аўтаматычная класіфікацыя тэкстаў, транскрыбацыя аўдыязапісаў, апрацоўка рукапісных тэкстаў і інш.

"The proposed presentation examines a series of real-world cases of data processing, particularly folklore and ethnographic data, using LLM models (ChatGPT, Claude, Gemini, etc.): automatic text classification, audio transcription, handwritten text processing, and others."

**Час і месца / Time and place: 26.09, 16.30-18.00 - 1.307 (Dorotheenstraße 24)**

**1. Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Заснаванне Belarus Voices: размова пра стварэнне новай серыі кніг / Founding Belarus Voices: A Discussion on Building a New Book Series**

мадэратар: Leukavets Victoria

**Канцэпцыя:**

Гэты круглы стол прысвечаны запуску серыі кніг «Галасы Беларусі» — новай

выдавецкай ініцыятывы, якая прадстаўляе працы беларускіх навукоўцаў, пісьменнікаў і культурных дзеячаў міжнародным чытачам на англійскай і нямецкай мовах. Серыя прапануе платформу для знаёмства з беларускімі поглядамі на ўнутраныя і глабальныя праблемы, пераадольваючы межы, дысцыпліны і пакаленні.
На гэтым мерапрыемстве ўдзельнікі паразважаюць пра матывацыю серыі, яе рэдакцыйнае бачанне і больш шырокае значэнне абмену беларускімі ведамі і творчасцю са светам. У дыскусіях будзе разгледжана, як галасы Беларусі могуць паўплываць на глабальныя дыскусіі аб гісторыі, ідэнтычнасці, дэмакратыі і будучыні Еўропы.

This roundtable aims to mark the launch of the Belarus Voices book series, a new publishing initiative that brings the work of Belarusian scholars, writers, and cultural figures to international readers in English and German. The series offers a platform for Belarusian perspectives on domestic and global issues - bridging borders, disciplines, and generations.
At this event, the participants will reflect on the motivations behind the series, its editorial vision, and the broader significance of sharing Belarusian knowledge and creativity with the world. Discussions will explore how Belarusian voices can inform global debates on history, identity, democracy, and Europe's future.

Удзельнікі прэзентацыі / Presentation participants: 1. Dr. Victoria Leukavets 2. Dr. Andreas Umpland 3. Dr. Aliaksei Bratachkin 4. Professor Tatiana Shchyttsova

### 2. Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Суверэннымі не нараджаюцца… Прэзентацыя першага тэматычнага нумара часопіса Free Belarus Journal / No One Is Born Sovereign… Presentation of the first thematic issue of Free Belarus Journal

мадэратар: Rudkouski Piotr

**Канцэпцыя:**

Будзе прадстаўлены першы тэматычны нумар новага акадэмічнага часопіса Free Belarus Journal. Тэма гэтага выпуску — суверэнітэт Беларусі ў геапалітычным, гістарычным і культурным вымярэннях. Сярод аўтараў — вядомыя даследчыкі і мысляры: Марыюш Машкевіч, Віктар Шадурскі, Генадзь Каршуноў, Пётр Рудкоўскі, Уладзімір Арлоў і іншыя.
Прэзентацыю правядзе др. Пётр Рудкоўскі, намеснік галоўнага рэдактара часопіса. У ёй таксама прыме ўдзел праф. Марыюш Машкевіч, галоўны рэдактар, былы амбасадар Польшчы ў Беларусі, а таксама, імаверна, некаторыя аўтары першага нумара.

The first thematic issue of the new academic journal Free Belarus Journal will be presented. The theme of this issue is Belarus’s sovereignty in geopolitical, historical, and cultural dimensions. Among the contributors are well-known scholars and thinkers: Mariusz Maszkewicz, Viktar Shadurski, Henadz Karshunou, Piotr Rudkouski, Uladzimir Arlou, and others.
The presentation will be led by Dr. Piotr Rudkouski, the journal’s deputy editor-in-chief. Prof. Mariusz Maszkewicz, the editor-in-chief and former ambassador of Poland to Belarus, will also take part, as will - most likely - several authors of the first issue.

**Час і месца / Time and place: 26.09, 16.30-18.00 - 1.402 (Dorotheenstraße 24)**

**Круглы стол / Round table, “Савецкая спадчына і яе культурны уплыў: ці патрэбная комплексная дэкамунізацыя і дэкаланізацыя беларускай культуры і палітыкі памяці?” / “Soviet Heritage and Its Cultural Influence: Is Comprehensive Decommunization and Decolonization of Belarusian Culture and Memory Politics Necessary?”**
мадэратар: Barkouski Pavel
**Канцэпцыя:**
Альтэрнатыўная назва круглага стала: "Культура адмены: кантраверсійныя пытанні спадчыны савецкага часу ў святле дэкамунізацыі. Ці трэба ставіць помнікі Машэраву і Мулявіну?"
Як ставіцца да постацяў і культурных здабыткаў савецкай эпохі, ці павінны яны ўвайсці ў нацыянальны канон?
Ці творчасць беларускіх аўтараў, якая ўтрымлівае ў сабе савецкія ідэалагічныя нарытывы, можа быць далей скарыстаная у адукацыйных і выхаваўчых працэсах у школах і ўніверсітэтах?
Ці творы, якія рэпрэзентуюць "сялянскі вобраз Беларусі" у творчасці аўтараў савецкай эпохі - гэта прыкмета самакаланізацыі або маркер нацыянальнай ідэнтычнасці, ад якога нельга адмаўляцца?
Ці варта дбаць пра помнікі дзеячам культуры і гісторыі савецкагау, роля якіх у нацыянальнай гісторыі застаецца неадназначнай - Пётр Машэраў, Уладзімір Мулявін, Алесь Дудар і іншыя?

Alternative title of the roundtable: "Culture of Cancellation: Controversial Issues of the Legacy of the Soviet Era in the Light of Decommunization. Should Monuments to Masherau and Muliavin Be Erected?"
How should we treat figures and cultural heritage of the Soviet era, should they enter the national canon?
Can the work of Belarusian authors, which contains Soviet ideological narratives, be further used in educational and upbringing processes in schools and universities?
Are works that represent the "peasant image of Belarus" in the work of authors of the Soviet era a sign of self-colonization or a marker of national identity that cannot be abandoned?
Should we care about monuments to figures of Soviet culture and history, whose role in national history remains ambiguous - Piotr Masherau, Uladzimir Muliavin, Ales Dudar and others?
Удзельнікі / Participants: : Антаніна Сцебур, Аляксей Ластоўскі, Алесь Чайчыц, Лізавета Дубінка-Гушча, Віктар Шадурскі, Вольга Раманава

**Час і месца / Time and place: 26.09, 16.30-18.00 - 1.403 (Dorotheenstraße 24)**

**Круглы стол / Round table, “Ці месца ў школе патрыятычнаму выхаванню?” / "Is there a place for patriotic education in school?"**
мадэратар: Ксенія Мартуль
**Канцэпцыя:**
Нядаўна апублікаваны артыкул Цімоха Акудовіча "Адукацыя vs беларусізацыя" зноў абудзіў публічную цікавасць да тэмы выхавання ў школе і паставіў шэраг вострых пытанняў у новым кантэксце рэформы беларускай школы пасля

дэмакратычнага транзіту і месца нацыянальна-патрыятычнаму выхаванню ў школьнай адукацыі. Ці сапраўды адукатары і навукоўцы па ту і гэту старану барыкад аказаліся закладнікамі ідэалагічных установак і не ў стане выйсці з кола палітычных залежнасцяў? Ці існуе розніца паміж “добрай” і “дрэннай” ідэялогіяй патрыятызму? Ці ёсць пэўная мяжа паміж акадэмічным і палітычным светам, якая робіць ідэалогію ў адукацыі "персонай нон-грата"? Ці магчыма якасная адукацыя на беларускай мове без палітычнай ангажаванасці ў сацыяльна-гуманітарных і палітычных навуках?” – такое кола пытанняў плануецца абмеркаваць на круглым стале з удзелам экспертаў, грамадскіх дзеячаў, палітыкаў і прадстаўнікоў шырокай грамадскасці.

The recently published article by Tsimokh Akudovich "Education vs. Belarusization" has reawakened public interest in the topic of education at school and raised a number of acute questions in the new context of the reform of the Belarusian school after the democratic transition and the place of national-patriotic education in school education. Have educators and scientists on both sides of the barricades really become hostages of ideological attitudes and are unable to break out of the circle of political dependencies? Is there a difference between "good" and "bad" ideology of patriotism? Is there a certain boundary between the academic and political worlds that makes ideology in education "persona non grata"? Is high-quality education in the Belarusian language possible without political engagement in the social, humanitarian and political sciences?" - such a range of questions is planned to be discussed at a round table with the participation of experts, public figures, politicians
and representatives of the general public.

Удзельнікі / Participants: Цімох Акудовіч (анлайн), Павел Церашковіч, Андрэй Лаўрухін, Ірына Сідорская, Марына Сакалова, Вольга Шпарага

### Час і месца / Time and place: 26.09, 16.30-18.00 - 1.405 (Dorotheenstraße 24)

### Круглы стол / Round table, Вусная гісторыя Беларусі за межамі краіны: перспектывы і выклікі / Oral History of Belarus Abroad: Perspectives and Challenges

мадэратар: Kedryk Tatsiana

**Канцэпцыя:**

Ідэалагічны ціск, які зведала гістарычная навука ў Беларусі за апошнія гады, аказаў значны уплыў і на вуснагістарычныя даследаванні. Правядзенне экспедыцый па вуснай гісторыі ўнутры краіны немагчымае, многія тэмы сталі небяспечнымі для даследавання, шмат якія беларускія гісторыкі апынуліся ў эміграцыі. Круглы стол будзе прысвечаны перспектывам і выклікам, якія маюць месца ў вуснай гісторыі Беларусі па-за межамі краіны. Спікеры прадставяць свае актуальныя праекты па вуснай гісторыі, абмяркуюць магчымасці і цяжкасці іх правядзення.

The ideological pressure that historical science in Belarus has experienced in recent years has had a significant impact on oral history research. Conducting oral history expeditions within the country is impossible, many topics have become dangerous for research, and many Belarusian historians have found themselves in emigration. The round table will be devoted to the prospects and challenges that occur in the oral history of Belarus outside the country. Speakers will present their current oral history projects, discuss the possibilities and difficulties of conducting them.

Удзельнікі / Participants: д.г.н. Алесь Смалянчук, к.г.н. Ірына Махоўская, к.г.н. Ірына Раманава, PhD Аніка Вальке, Ганна Міхальчук.

### Час і месца / Time and place: 26.09, 16.30-18.00 - 1.504 (Dorotheenstraße 24)

### Круглы стол / Round table, Ex Libris. Грамадскія навукі і адаптацыі Сяргея Лазніцы: ад Васіля Быкава да Джонатана Літэла / Ex Libris. Social sciences and adaptations of Sergei Loznitsa: from Vasil Bykau to Jonathan Littell

мадэратар: Paulau Barys

**Канцэпцыя:**

Круглы стол «Экслібрыс. Грамадскія навукі і адаптацыі Сяргея Лазніцы: ад Васіля Быкава да Джонатана Літэла» даследуе, як літаратурныя тэксты трансфармуюцца ў кінематаграфічныя наратывы, якія закранаюць пытанні памяці, траўмы і калектыўнай ідэнтычнасці. Разглядаючы адаптацыі Лазніцай твораў Васіля Быкава і Джонатана Літэла, дыскусія будзе прысвечана перасячэнню літаратуры, кіно і сацыяльных навук, засяроджваючыся на тым, як гісторыі вайны, гвалту і гістарычнага досведу пераасэнсоўваюцца ў больш шырокіх культурных і палітычных кантэкстах. Гэты дыялог мае на мэце падкрэсліць ролю адаптацыі як творчай і аналітычнай практыкі, адкрываючы новыя перспектывы на сацыяльныя функцыі мастацтва ў фарміраванні грамадскага разумення мінулага.
The round table “Ex Libris. Social Sciences and Adaptations of Sergei Loznitsa: from Vasil Bykau to Jonathan Littell” will explore how literary texts are transformed into cinematic narratives that engage with questions of memory, trauma, and collective identity. By examining Loznitsa’s adaptations of works by Vasil Bykau and Jonathan Littell, the discussion will address the intersections of literature, film, and the social sciences, focusing on how stories of war, violence, and historical experience are reinterpreted for broader cultural and political contexts. This dialogue aims to highlight the role of adaptation as both a creative and analytical practice, opening new perspectives on the social functions of art in shaping public understanding of the past.

Удзельнікі / Participants: 1. Барыс Паўлаў / Barys Paulau (Навукоўцы без межаў, MA in Sociology), 2. Андрэй Масквін / Andriej Moskwin (Uniwersytet Warszawski, PhD with habilitation); 3. Марыя Булавінская / Maryia Liapina-Bulavinskaya ("Visual History and Urban Research Lab", Master of Historical Sciences), 4. Кацярына Андронава / Katsiaryna Andronava (MA in Public Policy); 5. Наташа Друбэк / Natascha Drubek, PhD in Slavic Studies & History of Eastern Europe.

### Час і месца / Time and place: 26.09, 20.00-22.30 - PANDA platforma Knaackstraße 97 (im kleinen Hof der Kulturbrauerei), 10435 Berlin

### Публічная прэзентацыя / Public Presentation, Прэзентацыя рамана Змітра Вішнёва “Я — тое мяса, якое прыгатаваў Зміцер” і канцэрт-імправізацыя Андрэя Штайнке / Book launch of the new novel „I’m the meat that Zmicier has prepared“ by Zmicier Vishniou & improvised concert by Andrei Steinke

мадэратар: Iryna Herasimovich

**Канцэпцыя:**

Раман-лабірынт беларускага эмігранта, які нагадвае адначасова падарожжа Дантэ ў пекла, плаванне Адысея дадому і камп’ютарную гульню-блукалку, у якой трэба адшукаць выйсце і выжыць. У загадкавым тунэлі пад Берлінам галоўнаму герою давядзецца сутыкнуцца з уласнымі страхамі і спазнаць самога сябе.
Кніга Змітра Вішнёва «Я – тое мяса, якое прыгатаваў Зміцер» выйшла ў выдавецтве Skaryna Press у межах акцыі "33 кнігі для іншай Беларусі" пры падтрымцы Goethe-Institut.
Андрэй Штайнке будзе імправізаваць на бас-гітары на працягу мерапрыемства.

"I’m the meat that Zmicier has prepared" is a labyrinth-like novel of a Belarusian emigrant, reminiscent of Dante's journey to the underworld, Odysseus' voyage home, and an exploration computer game, in which you have to find the way out and survive. In a mysterious tunnel under Berlin, the protagonist has to face his own fears and discover himself.
Zmicier Vishniou's book "I’m the meat that Zmicier has prepared" was published by Skaryna Press as part of the "33 Books for Another Belarus" campaign with the support of the Goethe-Institut.
Andrei Steinke will be improvising on bass guitar throughout the event.

<https://panda-platforma.berlin/events/im-the-meat-that-zmicier-has-prepared/>